# Студэнты ўніверсітэта культуры прадставілі выставу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Арт-трансфармацыя»

23.09.2022 09:11

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» пачала працу выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Арт-трансфармацыя».**



Эксперты адзначаюць гарманічную трансфармацыю студэнцкіх работ кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва ад вытокаў і традыцыйных формаў у сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.



У экспазіцыі праглядаецца разнастароннасць студэнцкіх твораў, умелае выкарыстанне разнастайных відаў і напрамкаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.



Выставачны праект прымеркаваны да Года гістарычнай памяці. Мэтай экспазіцыі з'яўляецца рэалізацыя творчага патэнцыялу студэнтаў, якія любяць сваю Радзіму і вывучаюць яе гісторыю.

У выставачнай прасторы прадстаўлены традыцыйныя і сучасныя работы студэнтаў кафедры ДПМ БДУКМ, якія дэманструюць творчыя ўменні маладых аўтараў. У акадэмічнай аснове прац прысутнічаюць авангардныя прыёмы, сучасныя стылявыя рашэнні і увасабленне самых смелых ідэй студэнтаў.

Эксперыментальныя і творчыя работы прадстаўляюць глыбокае асэнсаванне гісторыі і памяці беларускай культуры.

Выстава «Арт-трансфармацыя» працягнецца да 5 кастрычніка 2022 года.

Фота – buk.by